# ЗАВОЧНАМУ ФАКУЛЬТЭТУ –30 ГАДОЎ

**Министерство высшего и среднего специального образования Белорусской ССР**
**ПРИКАЗ №56**

**29 января 1974 г.**

**О создании заочного факультета в Гомельском государственном университете**

**В целях совершенствования учебного процесса, улучшения качества подготовки специалистов с университетским образованием без отрыва от производства**

**Приказываю:**

**1. Создать в Гомельском государственном университете заочный факультет, передав ему контингент студентов-заочников по всем специальностям в количестве 2194 человек.**

**2. Планово-финансовому Управлению Министерства /тов. Дедкову Ф.Т./ выделить Гомельскому государственному университету для этого факультета штатные единицы: декана и заместителя декана.**

**Министр Н.М. МЕШКОВ.**

**Гомельский государственный университет**

**ПРИКАЗ №158-ОК**

**от 10 июля 1974 г. г. Гомель**

**1. В целях совершенствования учебного процесса, улучшения качества подготовки специалистов с университетским образованием без отрыва от производства и в соответствии с приказом Министра высшего и среднего специального образования БССР №56 от 29 января 1974 года создать заочный факультет, передав ему контингент студентов-заочников по всем специальностям отделения заочного обучения.**

**2. Временно, до избрания по конкурсу, доцента кафедры политэкономии ТРАЦЕВСКУЮ Тамару Павловну назначить исполняющей обязанности декана заочного факультета с 1 июля 1974 г.**

**Ректор университета доктор физико-математических наук / Б.В. БОКУТЬ/**

**согласован: доцент Д.А. ЛЕОНЧЕНКО**
**В.В. КОЗЛОВ**
**Р.К. КАЦКОВА**

**1 мая г.г. споўнілася 35 гадоў з таго моманту, калі Гомельскі педагагічны інстытут імя В.П. Чкалава быў пераўтвораны ў Гомельскі дзяржаўны універсітэт. У тыя гады падрыхтоўка спецыялістаў па завочнай форме навучання ажыццяўлялася на завочных аддзяленнях існаваўшых тады 5-ці факультэтаў. Прарэктарам па завочнаму навучанню з'яўлялася кандыдат эканамічных навук, дацэнт Т.П. Трацэўская. Рэктарат і дэканаты факультэтаў, на якіх вялося навучанне студэнтаў-завочнікаў, шмат увагі ўдзялялі пераводу вучэбнага працэсу на універсітэцкія вучэбныя планы.**

## ЗАПАТРАБАВАНАСЦЬ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ – ГАЛОЎНЫ КРЫТЭРЫЙ



Ідзе абмеркаванне ходу летняй залікова-экзаменацыйнай сесіі на завочным факультэце.

**З** мэтай ўдасканалення вучэбнага працэсу, паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці па хадайніцтву рэктара універсітэта прафесара Б.В. Бокуця ў студзені 1974г. Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР прыняло рашэнне аб стварэнні ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце завочнага факультэта. Новастворанаму факультэту перадаваўся кантынгент студэнтаў па 8 спецыяльнасцях у колькасці 2194 чал. У адпаведнасці з загадам міністра М.М. Мяшкова рэктарат універсітэта прыняў рашэнне аб адкрыцці завочнага факультэта, усклаўшы з 1 ліпеня 1974 г. выкананне абавязкаў яго дэкана на дацэнта Т.П. Трацэўскую. Намеснікам дэкана быў прызначаны в.а. дацэнта кафедры рускай літаратуры У.М. Сабаленка, якога потым змяніла на гэтай пасадзе Н.Р. Ткачэнка. Метадыстамі факультэта ў той час працавалі І.А. Мендзак, Г.М. Нячаева і Н.Р. Рандоўцава.

На пасаду прарэктара па завочнаму навучанню быў прызначаны кандыдат біялагічных навук А.І. Балтоўскі. У 80-90-х гадах прарэктарамі па завочнаму навучанню працавалі кандыдат педагагічных навук Л.Н. Сечка і кандыдат філалагічных навук М.М. Воінаў.

Падрыхтоўка спецыялістаў без адрыву ад вытворчасці ў першыя гады існавання факультэта вялася па 8 спецыяльнасцях: гісторыя, беларуская мова і літаратура, руская мова і літаратура, біялогія, матэматыка, эканоміка працы, механізаваная апрацоўка эканамічнай інфармацыі і фізічная культура.

У студзені 1977 г. работу завочнага факультэта правярала камісія Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі БССР, якая разам са станоўчымі момантамі адзначыла шэраг недахопаў у арганізацыі вучэбнага працэсу: не ўлічвалася спецыфіка завочнага навучання, а таксама спецыяльнасцей пры чытанні лекцый, мала выкарыстоўваліся наглядныя дапаможнікі і тэхнічныя сродкі, яшчэ шмат працавала на факультэце выкладчыкаў-пагадзінавікоў.

У 1978-1988 гг. завочны факультэт узначальвала дацэнт кафедры педагогікі, кандыдат педагагічных навук Г.В. Саннікава. У гэты час намеснікамі дэкана працавалі А.А. Станкевіч, А.П. Смоліна, Л.Ф. Кахоўская, Л.С. Лазучэнкава, Дз.П. Юшчанка, У.І. Бобрык.

Патрэбнасць розных галін народнай гаспадаркі рэгіёна ў спецыялістах высокай кваліфікацыі выклікала неабходнасць іх падрыхтоўкі ва універсітэце. З кожным годам прыём на завочны факультэт павялічваўся. У 1982 годзе на першы курс было прынята 535 чалавек. Найбольшай папулярнасцю карысталіся спецыяльнасці "Эканоміка працы", "Механізаваная апрацоўка эканамічнай інфармацыі", "Біялогія". Сярод прынятых на першы курс, студэнты, якія працавалі па абранай у вну спецыяльнасці, складалі амаль 80%. Усяго ў пачатку 1982-1983 навучальнага года на факультэце вучылася каля трох тысяч студэнтаў.

Дэканат факультэта і кафедры прыкладвалі шмат намаганняў па ўдасканаленню вучэбнага працэсу, удзяляючы ўвагу арганізацыі самастойнай работы студэнтаў у міжсесійны перыяд. Адной з форм кантролю за самастойнай работай было правядзенне калеквіумаў па асноўных раздзелах вывучаемых дысцыплін. З мэтай паляпшэння якасці падрыхтоўкі спецыялістаў рэктарат запрашаў для чытання лекцый, кіравання дыпломнымі работамі і ў якасці старшынь ДЭК вядучых навукоўцаў з АН БССР і вопытных выкладчыкаў з БДУ.

**К**афедрамі універсітэта надавалася важнае значэнне ўдзелу студэнтаў-завочнікаў у вучэбна-даследчыцкай і навуковай рабоце. У 1981-1982 навучальным годзе на рэспубліканскім конкурсе студэнцкіх навуковых прац 8 з 11 прадстаўленых былі ўдастоены І катэгорыі. Сярод дыпламантаў конкурсу былі Ю.Я. Данешчык і К.Я. Палітыка (спец. "Эканоміка працы"), Т.Ф. Атрошчанка, Н.М. Маркелава і Л.І. Шалькевіч (спец. "Біялогія"), М.Р. Тужык (спец. "Гісторыя"). Спецыфіка завочнага навучання не дазваляе забяспечыць шырокі ўдзел студэнтаў у навукова-даследчай рабоце. Але разам з тым па выніках удзелу ў рэспубліканскіх конкурсах студэнцкіх работ у 1992-1994 гг. 6 студэнтаў завочнага факультэта атрымалі дыпломы Міністэрства адукацыі рэспублікі.



**Асістэнт кафедры грамадзянска-прававых дысцыплін Л.П. Васільева чытае лекцыю студэнтам 3 курса спецыяльнасці "Правазнаўства".**

З 1984-1985 навучальнага года пачаўся пераход на падрыхтоўку спецыялістаў па новых тыпавых вучэбных планах, зацверджаных Міністэрствам вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР. У 80-х гадах у кіраўнікоў прадпрыемстваў і арганізацый мелася зацікаўленасць у падрыхтоўцы спецыялістаў з універсітэцкай адукацыяй. Гэта спрыяла ўстанаўленню цесных сувязей універсітэта з прадпрыемствамі і ўстановамі г. Гомеля і вобласці. З прадстаўнікоў партыйных, савецкіх і гаспадарчых органаў, грамадскіх арганізацый ствараліся саветы садзейнічання завочнаму навучанню. У функцыі гэтых саветаў, якія дзейнічалі на грамадскіх пачатках, уваходзілі падбор кандыдатур і накіраванне іх на вучобу для падрыхтоўкі спецыялістаў, у якіх мелася патрэба ў раёне, або на прадпрыемстве ці ва ўстанове, стварэнне неабходных умоў для вучобы студэнтаў-завочнікаў і інш. Саветы садзейнічання існавалі ў Брагінскім, Лоеўскім, Хойніцкім і іншых раёнах вобласці, на шэрагу прадпрыемстваў г. Гомеля. Аднак пад час грамадска-палітычных змен і пагаршэння сацыяльна-эканамічнага становішча ў народнай гаспадарцы ў другой палове 80-х гадоў саветы перасталі існаваць. Прычынай таму з'явілася негатыўнае стаўленне кіраўнікоў прадпрыемстваў да праблемы падрыхтоўкі спецыялістаў на перспектыву.

**У правядзенні розных форм заняткаў на факультэце задзейнічаны звыш 330 выкладчыкаў з 45 універсітэцкіх кафедр.**

З канца 80-х і на пачатку 90-х гадоў на завочным факультэце стала ажыццяўляцца падрыхтоўка па новых спецыяльнасцях: бухгалтарскі ўлік, кантроль і АГД, геаграфія, эканоміка і кіраванне прадпрыемствам, правазнаўства. У 1994 г. пачала навучанне на 3-ім курсе спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура" група з 20 студэнтаў-выпускнікоў Рэчыцкага педагагічнага каледжа. Затым, у канцы 90-х і ў пачатку новага стагоддзя, на факультэце былі адкрыты спецыяльнасці: "Аўтаматызаваныя сістэмы апрацоўкі інфармацыі", "Фінансы і крэдыт"; спецыялізацыі – "Лячэбная фізічная культура" і "Дашкольнае фізічнае выхаванне" на спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт". Летась пачалі сваю вучобу ва універсітэце 44 студэнты-завочнікі па новай спецыяльнасці "Лясная гаспадарка". Усяго па 13 спецыяльнасцях і 21 спецыялізацыі завочнага факультэта атрымоўваюць падрыхтоўку звыш 3200 студэнтаў. Улічваючы пераемнасць паміж рознымі этапамі і ўзроўнем навучання на факультэце ажыццяўляецца падрыхтоўка спецыялістаў са скарочанымі тэрмінамі навучання на базе вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі па шэрагу спецыяльнасцей ("Правазнаўства", "Фінансы і крэдыт", "Фізічная культура і спорт" са спецыялізацыямі ЛФК і ДФВ і інш.). На факультэце створаны ўмовы для асоб, якія атрымоўваюць другую вышэйшую адукацыю, у тым ліку і для студэнтаў дзённай формы, якія вучацца паралельна.

**В**ынікам плённай сумеснай працы рэктарата, дэканата завочнага факультэта, філалагічных кафедр універсітэта і кіраўніцтва Рэчыцкага педагагічнага каледжа стала стварэнне ў пачатку 1995 года навукова-метадычнага аб'яднання, што дазволіла скаардынаваць вучэбны план каледжа з універсітэцкім па спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура". Прадастаўленне лепшым выпускнікам каледжа магчымасці працягваць вучобу на 3-ім курсе завочнага факультэта – гэта яшчэ адзін з механізмаў, дзякуючы якому сістэма бесперапыннай адукацыі паспяхова функцыянуе і пераконвае ў сваёй перспектыўнасці. Як сведчаць вынікі здачы дзяржаўных экзаменаў і абароны дыпломных работ за апошнія гады, якасць ведаў у студэнтаў-выпускнікоў, якія працягвалі вучобу пасля педкаледжа, вышэйшая за сярэднюю па гэтай спецыяльнасці.

Ужо ў 1992 г. з дыпломам ГДУ імя Ф. Скарыны быў выпушчаны 10-тысячны, а ў 2003 г. – 15-тысячны спецыяліст, які атрымаў адукацыю без адрыву ад вытворчасці. За 30 гадоў факультэт падрыхтаваў больш за 13760 спецыялістаў, а за гады існавання універсітэта па завочнай форме навучання было падрыхтавана звыш 15850 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй. У тым ліку 65 выпускнікоў атрымалі дыпломы з "адзнакай" (найбольшая колькасць 9 – у 2002 г.). Сярод іх: А.В. Брадзіхіна, І.В. Крукава, М.Р. Курашоў, А.Л. Адамава, А.Л. Сяргееў, К.А. Смірнова, В.В. Сахарчук, Н.М. Сарнаўская, І.М. Кулакова, М.Э. Александровіч, С.М. Анюкоў, В.М. Княгіна, М.В. Лапіцкі, Т.Я. Сушко, С.А. Ягорава.

Многія з тых, хто атрымаў адукацыю па завочнай форме навучання, працуюць як у Беларусі, так і за яе межамі ў розных галінах народнай гаспадаркі: у сферы адукацыі і культуры, дзяржаўнага кіравання і фінансаў, у банкаўскай сістэме і інш.

Гонарам завочнага факультэта з'яўляюцца яго выпускнікі: А.А. Бяляеў – першы намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама, А.В. Лук'яновіч – начальнік упраўлення адукацыі Гомельскага аблвыканкама, В.А. Каляда – доктар педагагічных навук, прафесар БДУ, Н.У. Радзьковіч – дырэктар ААТ "Гомельскі камбінат будаўнічых канструкцый", С.І. Уткін – дырэктар унітарнага прадпрыемства "Медтэхніка", В.Р. Кругляков – начальнік АБЭЗ УУС Гомельскага аблвыканкама, Ю.П. Кажаеў – рэктар Маскоўскага інстытута прававой эканомікі, І.В. Журкевіч – галоўны бухгалтар Гомельскага аблвыканкама, Г.У. Азяўчыкава – намеснік галоўнага бухгалтара універсітэта, А.М. Кротаў – намеснік дырэктара завода па эканамічных пытаннях, І.А. Бароўская – кандыдат філалагічных навук, выкладчык кафедры беларускай мовы ГДУ, Ю.Д. Сокал – начальнік пашпартна-візавай службы РАУС Навабеліцкага раёна, Л.Н. Сечка – доктар палітычных навук, прафесар, Л.Ф. Трошка – настаўнік гісторыі з Ельскага раёна, В.М. Марозава – супрацоўнік рэдакцыі газеты "Гомельскі універсітэт", Я.Д. Абрамчук – галоўны бухгалтар і Я.С. Чорны – начальнік аддзела Гомельскага рэгіянальнага банка "Белзнешэканомбанк", С.П. Папенка – дырэктар філіяла №321 АСБ "Беларусбанк"; Мікалай Кіраў, Віктар Пусеў, Сяргей Смаль, Алена Палявая, Алена Маракуца – майстры спорту і майстры спорту міжнароднага класа і многія іншыя.

**За 30 гадоў факультэт падрыхтаваў больш за 13760 спецыялістаў, а за гады існавання універсітэта па завочнай форме навучання было падрыхтавана звыш 15850 спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй.**

**Па 13 спецыяльнасцях і 21 спецыялізацыі завочнага факультэта атрымоўваюць падрыхтоўку звыш 3200 студэнтаў.**

**С**ярод падзей, звязаных з дзейнасцю факультэта, найбольш значнымі ў апошнім дзесяцігоддзі сталі яго паспяховая атэстацыя ў 1998 г. і правядзенне ў красавіку 2001 г. навукова-метадычнай канферэнцыі "Актуальныя пытанні навукова-метадычнай работы. Арганізацыя завочнага навучання: вопыт, змест, методыка". На пленарным пасяджэнні і ў 5-ці секцыях удзельнікі канферэнцыі заслухалі і абмеркавалі звыш 120 дакладаў і паведамленняў, прысвечаных актуальным праблемам методыкі выкладання вучэбных дысцыплін з улікам спецыфікі завочнага навучання, былі вызначаны шляхі далейшага ўдасканалення вучэбнага працэсу на факультэце. Адзначалася, што важнейшымі накірункамі ў рабоце са студэнтамі з'яўляюцца арганізацыя самастойнай работы і метадычнае забеспячэнне вучэбнага працэсу. На жаль, забяспечанасць студэнтаў факультэта вучэбнай і вучэбна-метадычнай літаратурай пакуль яшчэ не высокая. Таму актуальным з'яўляецца яе стварэнне сіламі выкладчыкаў. Такая праца павінна стаць прыярытэтнай у арганізацыі вучэбна-метадычнай работы універсітэцкіх кафедр.

З 2001-2002 навучальнага года на факультэце пачалася падрыхтоўка спецыялістаў па новых рабочых вучэбных планах, распрацаваных на аснове адукацыйных стандартаў і базавых вучэбных планаў спецыяльнасцей, якія прадугледжваюць пашырэнне сферы прымянення актыўных метадаў і форм арганізацыі навучання, сучасных інфармацыйных тэхналогій. У правядзенні розных форм заняткаў на факультэце задзейнічаны звыш 330 выкладчыкаў з 45 універсітэцкіх кафедр, сярод якіх нямала вопытных (70% з вучонымі ступенямі і званнямі). З павагай адносяцца студэнты факультэта да такіх выкладчыкаў, як дактары навук, прафесары У.М. Калмыкоў, А.А. Станкевіч, М.В. Селькін, Л.М. Сапегін, Л.А. Шамяткоў, Р.Р. Лазько, У.П. Бабына, У.І. Коваль, В.С. Новак, Ф.У. Кадол; дацэнты У.Ф. Філіпцоў, Л.С. Баннікава, У.І. Качаткоў, Т.В. Карпей, А.В. Бузланаў, Т.Д. Трацэўская, У.А. Бобрык; старшыя выкладчыкі В.Д. Падасінаў, Л.М. Яфіменка, М.П. Савінская, В.Ф. Сеніна і многія іншыя.

На працягу многіх гадоў у складзе дэканата факультэта працуюць вопытныя метадысты Н.В. Каклеева, Т.В. Курашова, А.А. Малашчанка, Н.Д. Скамарохава, якія вызначаюцца кампетэнтнасцю ў пытаннях па арганізацыі метадычнай работы. На дастаткова прафесійным узроўні працуюць і сакратары-машыністкі Т.І. Гадунова, С.У. Лапцева, Ю.А. Самусенка, А.У. Сергіенка, Г.М. Яськова, якія дарэчы таксама атрымоўваюць вышэйшую адукацыю на сваім факультэце. Арганізатарамі вучэбнага працэсу з'яўляюцца намеснікі дэкана Л.Ф. Кахоўская, Дз.П. Юшчанка і Р.У. Серыкаў, якія з вялікай адказнасцю адносяцца да даручанай справы, шмат робяць для ўдасканалення вучэбна-метадычнай работы.

**З** нагоды 30-годдзя завочнага факультэта сардэчна віншую ўсіх яго студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў з пажаданнямі поспехаў у вучобе і плёну ў працы.

Выказваю шчырую ўдзячнасць рэктарату, усім службам універсітэта за ўвагу і рэальную дапамогу ў арганізацыі вучэбнага працэсу з надзеяй на паляпшэнне матэрыяльнага забеспячэння жыццядзейнасці факультэта.

**М.МУРАШКА,**
**дэкан завочнага факультэта, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

**Фота: У. ЧЫСЦІКА.**

# 3 ИЮЛЯ – 60 ЛЕТ СО ДНЯ ОСВОБОЖДЕНИЯ БЕЛАРУСИ ОТ НЕМЕЦКО-ФАШИСТСКИХ ЗАХВАТЧИКОВ

**«Слава отцов, боевые традиции, выкованные ими в боях, – это не мертвый капитал, не сабля, вложенная в ножны. Гордиться славными боевыми традициями – это значит своими делами на благо Родины приумножать их, быть достойными бессмертных подвигов героев, нести вперед наши боевые знамена чистыми, незапятнанными».**

**(С. Тимошенко, Маршал Советского Союза, дважды Герой Советского Союза).**



**Михаил ЛУКОНИН**

*Все, что свершилось, –*
*памятно и свято.*
*Навеки будут рядом,*
*без конца –*
*могила*
*Неизвестного солдата*
*и Счастье*
*Победившего бойца!*

## НАС ЖДАЛИ, И МЫ ПРИШЛИ!

Борьба за освобождение Белоруссии началась еще в сентябре 1943 года – сразу же после того, как были разгромлены немецко-фашистские армии на Курской дуге. Тогда войска Центрального фронта форсировали реку Сож – приток Днепра – южнее Гомеля и, таким образом, вступили на землю Белоруссии, захватив обширные плацдармы. Центральным фронтом командовал генерал армии Константин Константинович Рокоссовский.

При наступлении в междуречье Сожа и Днепра и в последующих боях активно, с большим успехом действовали войска 65-й армии, которой командовал генерал П.И. Батов. Их поддерживал 4-й артиллерийский корпус прорыва под командованием генерала Н.В. Игнатова. Войска 65-й армии форсировали Днепр севернее Лоева. Тогда совершила свой подвиг батарея 279-го артиллерийского полка под командованием гвардии капитана Петра Чудинова.

За подвиг, совершенный при форсировании Днепра, и стойкость, проявленную в бою за удержание плацдарма, Петру Алексеевичу Чудинову посмертно присвоено звание Героя Советского Союза.

***

В октябре 1943 года Ставка Верховного Главнокомандования переименовала Центральный фронт в Белорусский (в феврале 1944 года он стал именоваться 1-м Белорусским). Командовал фронтом по-прежнему К.К. Рокоссовский.

10 ноября 1943 года войска Белорусского фронта начали Гомельско-Речицкую наступательную операцию. Мы старались приковать к этому участку побольше вражеских войск, чтобы дать возможность другим фронтам развивать успешные боевые действия. 17 ноября наши войска освободили Речицу, а 26 ноября был освобожден Гомель.

Вскоре в Гомель прибыло командование 1-го Белорусского фронта. Промозглый ноябрьский ветер уныло завывал в выгоревших коробках домов. Казалось, город полностью вымер. На улицах не видно было ни одного гражданского человека. Груды развалин оставил враг от Гомеля, который до войны был одним из красивейших городов Белоруссии.

Штаб фронта уступил свое помещение возвратившемуся Правительству БССР для размещения наркоматов. ЦК Коммунистической партии Белоруссии и Совнарком БССР разместились в Ново-Белице, в здании бывшего противотуберкулезного диспансера.

Вскоре стало известно, что в районе Озаричей фашисты устроили лагерь, где томится свыше 30 тысяч советских людей. Выяснилось, что большинство из них заражено сыпным тифом. Враг заразил эту массу людей, рассчитывая, что, общаясь с Красной Армией, они занесут эпидемию сыпного тифа в наши войска.

Первый секретарь ЦК КП(б)Б тов. П.К. Пономаренко встретился с командующим фронтом К.К. Рокоссовским. Были разработаны мероприятия по спасению людей, томившихся в лагере, создана специальная правительственная комиссия. В борьбу за ликвидацию тифа включился и нарком внутренних дел БССР С.С. Бельченко. Штаб фронта выделил в распоряжение комиссии необходимое количество автотранспорта, медицинских работников, медикаментов, продовольствия. Между лагерем и Гомелем была установлена надежная связь по ВЧ. Эпидемия была предотвращена.

К началу 1944 года войска нашего Белорусского фронта, преодолевая все усиливающееся сопротивление врага, достигли рубежа Днепр, Паричи, Мозырь, Верба. В апреле войска намного улучшили свое положение. 3-я армия заняла плацдарм на западном берегу Днепра, севернее Рогачева, 48-я – на северном берегу Березины, 65–я армия овладела Калинковичами и Мозырем.

Началась деятельная подготовка Белорусской стратегической операции «Багратион», в которой проявились великолепные боевые качества воинов всех родов войск.

Для немецко-фашистского командования Белоруссия имела очень важное стратегическое значение. Именно здесь группа армий «Центр» под командованием фельдмаршала Буша прикрывала два важнейших направления, ведущих в Восточную Пруссию и Польшу. Это был кратчайший путь прямо в логово врага – в Германию. К тому же удержание Белоруссии позволяло немецко-фашистскому командованию обеспечить стратегическое взаимодействие между группами армий «Север», «Центр» и «Северная Украина».

Противник сосредоточил в Белоруссии войска численностью 1,2 миллиона человек (с учетом тылов). В составе этих войск имелось около 10 тысяч орудий и минометов, свыше 900 танков и штурмовых орудий, до 1300 самолетов. Наиболее крупные вражеские группировки были сосредоточены в районах Витебска и Бобруйска, то есть на обоих флангах всей группы войск, расположенных на Белорусской дуге.

Чтобы прочней удерживать Белоруссию, враг создал здесь глубокоэшелонированную оборону. Главная полоса тактической обороны имела глубину 6-8 километров.

Такую могучую оборону врага предстояло сокрушить нашим войскам. 1-му Белорусскому фронту предстояло провести Бобруйскую операцию.

Как намечалось ее осуществить? Из воспоминаний К.К. Рокоссовского:

«Командование фронта убедилось в том, что на бобруйском направлении необходимо наносить два удара: один с плацдарма 3-й армии по северному берегу Березины на Бобруйск и второй – по южному берегу Березины в обход Бобруйска с юга. Оба удара были главными, чему соответствовало и последующее распределение сил фронта.

Это решение нарушило установившиеся правила, по которым в начале операции армия, фронт наносят один главный удар, где и сосредоточивается большая часть сил и средств, а на других участках организуются вспомогательные удары с основной задачей — сковать противника. Таким путем предотвращается распыление сил. Но в данном случае мы вынуждены были идти на распыление сил и прежде всего потому, что условия лесисто-болотистой местности не позволяли вложить в удар на одном участке всю огромную силу, которой располагал фронт».

Ставка Верховного Главнокомандования утвердила замысел руководства фронта.

Наступление войск 1-го Белорусского фронта началось 24 июня. Как и намечалось, были одновременно нанесены два удара: из района Рогачева и из района южнее Бобруйска. Наступление началось мощной артиллерийской подготовкой.

Наши наступательные действия в Белорусской операции развивались очень стремительно. Это позволило армиям совершать окружение противника. Ликвидация окруженных немецких дивизий происходила небывалыми темпами.

Тем не менее в ряде мест враг сопротивлялся очень сильно, делал все, чтобы спастись. Так, группе противника численностью до 5 тысяч человек удалось прорваться из окружения под Бобруйском и двинуться к Осиповичам. Врагу очень важно было вернуть этот узел коммуникаций, воспользоваться его аэродромом, чтобы обеспечить посадку своих самолетов.

... Завершив Бобруйскую операцию, войска нашего фронта преследовали врага на барановичском и минском направлениях.

После освобождения Слуцка наши войска устремились дальше на запад.

В результате семидневных боев (с 24 по 30 июня 1944 года) войска правого крыла нашего фронта прорвала вражескую оборону на 200-километровом фронте, окружили и разгромили в районе Бобруйска основанные силы 9-й армии врага и, продвинувшись на 100-125 километров, создали благоприятные условия для развития наступления на Минск и Барановичи.

Продолжая преследовать врага, наши войска перерезали дорогу Минск-Барановичи. За сутки до освобождения Минска войска перерезали железные дороги, ведущие от Минска на северо-запад и на юго-запад. 3 июля 1944 года столица Белоруссии была полностью освобождена от врага.

**В. КАЗАКОВ,**
**Маршал артиллерии,**
**Герой Советского Союза**
**(из книги «В боях за Белоруссию»).**

## ЯНЫ ВЫЗВАЛЯЛІ НАШ РОДНЫ КРАЙ

**На франтах, у падполлі, партызанскіх атрадах кавалася ў гады вайны перамога над фашызмам.**

**За свабоду і незалежнасць нашай роднай Беларусі змагаліся шмат удзельнікаў, ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, якія працавалі ў нашай навучальнай установе. Сярод іх:**

**У.Д. Арэшчанка,** былы загадчык кафедры эканомікі працы, дэкан эканамічнага факультэта, прафесар (І Беларускі фронт);

**У.І. Гурко,** былы дзяжурны санаторыя-прафілакторыя ГДУ (штурман далёкай бамбардзіровачнай авіяцыі, якая наносіла ўдары па нямецка-фашысцкіх войсках на тэрыторыі Беларусі, удзельнік Парада Перамогі 1945 г.);

**Г.С. Еўдакіменка,** к.г.н., дацэнт, былы прарэктар педінстытута імя В.П. Чкалава, заг. кафедры гісторыі БССР (ІІІ Беларускі, І Прыбалтыйскі франты);

**А.А. Косцікаў,** былы лабарант кафедры фізвыхавання (ІІІ Беларускі фронт);

**П.Ф. Мажайскі,** былы ст. лабарант факультэта фізвыхавання (І і ІІ Беларускія франты, удзельнік вызвалення г. Гомеля, удзельнік Парада Перамогі 1945 г.);

**П.Ф. Пракоф'еў,** былы ст. лабарант кафедры радыёфізікі (І Беларускі фронт);

**Р.Ф. Сандрагайлаў,** былы дворнік (І Беларускі фронт);

**М.Ф. Шкарбун,** былы нам. прарэктара па АГЧ (І, ІІ, ІІІ Беларускія франты);

**А.М. Цурганаў,** былы дэкан фізічнага факультэта (І, ІІ Беларускія франты);

**М.А. Ялецкі,** былы в.а. дэкана матфака (ІІ Беларускі фронт);

**Т.С. Янкова,** былы дацэнт кафедры рускага, агульнага і славянскага мовазнаўства (удзельніца партызанскага атрада);

**Я.В. Яршоў-Мазураў,** былы дацэнт кафедры філасофіі (удзельнік Мінскага падполля, партызанскага атрада імя Дзяржынскага, камсамольска-маладзёжнай дыверсійна-падрыўной групы).

### Участвуем в праздничных торжествах

Активными участниками торжественных мероприятий, посвященных 60-летию освобождения Беларуси, станут студенты нашего университета. 3-го июля 32 представителя от факультетов пройдут в праздничном шествии от Вечного огня до площади Восстания, где будут возложены венки к мемориалу жертвам фашизма. 100 юношей будут задействованы в культурно-спортивной программе, которая состоится на стадионе «Центральный».

Самодеятельные коллективы студенческого клуба ГГУ выступят с концертными номерами на площадках г. Гомеля.

Акция




### Великой Победе посвящается

**К 60-летию Великой Победы над немецко-фашистскими захватчиками под патронажем Гомельского областного исполнительного комитета организовывается уникальная в своем роде выставка – «Это наша с тобой биография».**

Дорогие земляки, вы можете помочь в ее организации. У многих из вас дома хранятся семейный реликвии – дорогие для вас фотоснимки, на которых, возможно, запечатлены укромные уголки старого Гомеля, райцентров, деревень Гомельщины, те или иные значительные события (военных лет и времен восстановления народного хозяйства), люди, вписавшие яркую строку в историю нашего родного края. Увы, жизнь быстротечна, но память человеческая – вечная. Вы сделаете доброе дело, если принесете в музей дорогие для вас фотографии, которые помогут нашим современникам прикоснуться к славному прошлому, пропустить через сердце чью-то великую судьбу, восхититься мужеством, добродетелью наших предков. Ведь из кирпичиков прошлого строится мост в будущее.

Мы будем очень признательны всем, кто поделится с музеем своими драгоценными материалами. Их можно прислать или принести по адресу: 246050 г. Гомель, площадь Ленина, 4, областной краеведческий музей, для выставки «Это наша с тобой биография» (возврат фотографий гарантируем). Контактный телефон в Гомеле: 53-48-24.

**Константин МИЩЕНКО,**
**директор Гомельского областного краеведческого музея.**

## ИХ ПОДВИГ ВЕЧЕН И СВЯТ

**(Памятники, братские, одиночные могилы воинов, улицы, связанные с Великой Отечественной войной)**

### Центральный район

**Памятники:**

Мемориальный комплекс гомельчан – Героев Советского Союза, полных кавалеров орденов Славы, почетных граждан города Гомеля, Героев Социалистического труда (ул. Советская, между домами №21 и 25);

Героям освобождения (Танк-34) (пл. Восстания);

Жертвам концлагеря (пл. Восстания, здание ф-ки «Труд»);

Комсомольцам Гомельщины (перекресток ул. Жарковского и ул. Карповича);

**Братские могилы:**

Народных ополченцев и Героя Советского Союза Бородина (ПкиО им. А.В. Луначарского);

Советских воинов, партизан и подпольщиков (пл. Труда);

Советских воинов и партизан (ул. Советская, Студенческий парк);

Подпольщиков (ул. Советская, Студенческий парк).

**Одиночные могилы:**

Председателя губрозыска Михайловского Г. (ул. Советская, Студенческий парк);

Председателя правления Западной железной дороги Вершиловича Я.Ф. (ул. Советская, Студенческий парк).

**Улицы:**

И.П. Кожара, В.Т. Каменщикова, И.Б. Катунина, К.Т. Мазурова, А.А. Свиридова, А.Е. Макаенка, Г.М. Головацкого, Г.И. Докутович.

Знай наших!

# КРАСАВИЦЫ – РЯДОМ

*Ольга Цыбранкова, студентка 2 курса биологического факультета, стала обладательницей почетного титула «Мисс-Гомель-2004 г.» на областном конкурсе красоты, который проводился модельным агентством «Грация». Поздравляем!*



**– Ольга, как ты попала на конкурс?**

– Предложила пойти подружка. Для меня все было неожиданно, хотя я знакома с людьми из модельного мира нашей республики и, в принципе, знала, что к чему.

**– Много было участниц?**

– 20 человек, в основном из г. Гомеля. Много красивых девушек. За три месяца до конкурса с нами работали профессиональные преподаватели хореографии, дефиле, высококлассные визажисты и парикмахеры. Все было очень серьезно.

**– А что оказалось самым трудным?**

– Первый выход. Волновалась так, что коленки дрожали, но надо было улыбаться. А потом – нормально, свыклась с ситуацией. Особенно понравилось выходить в вечернем платье от гомельского модельера Елены Шилец.

**– Какие номинации были в конкурсе?**

– "Мисс-Гомель", "Вице-мисс", "Мисс-грация", "Мисс-Интернет" и "Мисс зрительских симпатий". Я совсем не ожидала, что получу 1-е место. А тут – такое… Была очень счастлива.

**– Кроме короны какие-нибудь подарки вручили?**

– Корону только подержала, а в следующий раз (конкурс проводился в 9-й раз) передам ее другой красавице. Подарили компьютер от фирмы «River», телевизор от «Континента», набор косметики «Орифлейм».

**– Что поддерживало в процессе конкурса?**

– Конечно, родные и друзья. Их было так много в зале, и я чувствовала и слышала (!) их поддержку. Мне это очень-очень помогло, и я им благодарна.

**– Что-то изменилось в тебе после конкурса?**

– Я приобрела уверенность в себе, преодолела страх. И еще поняла, как много любящих людей меня окружает.

**– Собираешься дальше покорять подиум?**

– Нет. Я не думаю, что профессия модели – что-то серьезное. Ведь молодость и красота быстро проходят. А в жизни нужна стабильность, которой можно достичь, получив образование.

**Беседовала Т. ЦЕЛЕХОВИЧ.**
**Фото В. ЧИСТИКА.**

**Для нас, студентов 2 курса геолого-географического факультета, ст. преподавателем кафедры географии Владимиром Евгеньевичем Пашуком была организована экскурсия на Гомельский жировой комбинат. Она носила ознакомительный характер, закрепила наши знания, полученные при изучении учебного курса технико-экономические основы производства.**

# ОТЕЧЕСТВЕННОЕ – ЗНАЧИТ, КАЧЕСТВЕННОЕ

Общие сведения о предприятии, которое было открыто еще в далеком 1932 году, нам дал инженер по производственной деятельности А.С. Курако. Мы узнали, что основой предприятия является маргариновый цех. На комбинате производится также много сортов туалетного мыла, хозяйственное. Именно в мыловаренном цехе проходила основная часть нашей экскурсии. С помощью его начальника В.Е. Мельченко мы смогли увидеть весь технологический процесс мыловарения, убедились, насколько он сложный. Побывали мы в отделениях механической обработки мыла, готовой продукции.

Аргументированный рассказ Виталия Евгеньевича убедил нас в том, что их продукция натуральная и очень качественная, поэтому мы сделали свой выбор в ее пользу и советуем сделать это и вам.

Санитарно-гигиенические требования не дали нам возможности побывать в цехах по производству маргарина и майонеза, но продегустировать некоторые их виды и отметить наиболее понравившиеся нам, мы смогли.

Хотим выразить слова благодарности в адрес тех, кто помог нам организовать и провести интересную и познавательную экскурсию.

**Н. ВОРОНОВА, И. ИВАНЕНКО, А. АВСЯННИКОВ,**
**студенты 2 курса геолого-географического факультета.**

## Улыбнитесь!

☺ Студент пишет письмо отцу:

«Дорогой папа, $пешу $ообщить вам, что у меня в$е хорошо. Я учу$ь нормально. Правда, мне не $ов$ем легко. $ этой учебой я $овершенно не могу думать ни о чем другом. Пожалуй$та, вышли мне $рочную телеграмму. Я буду $частлив получить от тебя ве$точку. Твой $ын».

Вскоре пришло письмо от папаши:

«Сынок! Понимаю твое НЕТерпение. НЕ Трудись слишком сильно, а то будешь совсем НЕТрудоспособным. Если стаНЕТ совсем тяжело, пиши еще, если НЕТрудно. Я всегда помогу тебе советом. Папа». ☺☺☺

Студэнцкія вандроўкі

# СТАРАЖЫТНАЕ І СУЧАСНАЕ – ПОБАЧ

**Перад летняй сесіяй была арганізавана паездка студэнтаў філалагічнага факультэта ў горад Кіеў.**

Колькі хараства ў табе, горад на Дняпры! Колькі незабыўных уражанняў і ўспамінаў пакідаеш ты ў сэрцах людзей, якія прыязджаюць сюды, каб надыхацца паветрам старажытнасці! Як апісаць тваю магутнасць? Непаўторныя рака і парослыя дрэвамі ўзгоркі, унікальныя помнікі старажытнай архітэктуры, незабыўныя вуліцы, якія то бягуць уніз, то падымаюцца ў неба. Тут усё нагадвае чароўную казку.

Незвычайны саюз старажытнага і сучаснага звяртае на сябе ўвагу. Побач з Сафійскім саборам, Кіева-Пячорскай лаўрай мы бачылі вітрыны модных магазінаў, мігатлівыя агні "Казіно" і гасцініц.

Старажытны Кіеў быў буйным цэнтрам культуры на працягу многіх стагоддзяў, з'яўляўся цэнтрам Кіеўскай Русі. Менавіта тут у пачатку XII ст. быў створаны выдатны летапісны звод "Аповесць мінулых гадоў". Старажытны ландшафт застаўся ў першапачатковай некранутасці. Вось чаму так прыцягвае прырода горада. Па дарозе ў цэнтр Кіева вас сустракае велічная статуя – дзяўчына з вянком на галаве. Помнік на беразе Дняпра ў выглядзе ладдзі з трыма магутнымі мужчынскімі фігурамі і адной жаночай постаццю нагадвае легенду аб заснаванні горада трыма братамі – Кіем, Шчэкам, Харывам – і іх сястрой Лыбеддзю. Неапісальным з'яўляюцца Сафійскі сабор, Андрэеўская, Міхайлаўская, Уладзімірская цэрквы.

Пабывалі мы ў непаўторнай Кіева-Пячорскай лаўры – першым на Старажытнай Русі мужчынскім манастыры. Заснаваны ў 1051 годзе, ён атрымаў сваю назву ад пячор, дзе жылі першыя насельнікі – манахі. Лаўрамі называліся найбольш багатыя і ўплывовыя манастыры, якія карысталіся вялікай прывілеяй. Тут пахавана 118 манахаў, і сярод іх – летапісец Нестар, а таксама частка мошчаў Ефрасінні Полацкай.

У Кіеве захавалася шмат помнікаў, якія сведчаць аб яго славутай гісторыі: князю Уладзіміру, княгіне Вользе, жонцы князя Ігара, Б. Хмяльніцкаму. Акрамя таго, у Кіеве спыняўся А.С. Пушкін, вядомы французскі пісьменнік А. Бальзак знайшоў тут сваю нарачоную.

У г. Гомель студэнты вярнуліся шчаслівыя, многія прывезлі дадому "кіеўскі торт" з Крэшчаціка, цудоўны смак якога нагадваў пра знаходжанне ў чароўнай казцы.

**Вольга ВАСІЛЬЧЫК,**
**студэнтка гр. РБ-23 філфака.**

# Учреждение образования «Гомельский государственный университет имени Франциска Скорины» объявляет прием в аспирантуру в 2004 году

**с отрывом от производства по специальностям:**

- математический анализ;
- теория вероятностей и математическая статистика; математическая логика, алгебра и теория чисел;
- теоретическая физика;
- оптика;
- экология;
- материаловедение в машиностроении;
- телекоммуникационные системы и компьютерные сети;
- математическое моделирование, численные методы и комплексы программ;
- экономическая теория;
- экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности, в т.ч.: теория управления экономическими системами; макроэкономика; экономика и управления предприятиями, отраслями, комплексами; управление инновациями; региональная экономика; логистика; экономика труда; экономика народонаселения и демография; экономика природопользования; землеустройство и др.);
- финансы, денежное обращение и кредит;
- бухгалтерский учет, статистика;
- белорусская литература; русская литература;
- белорусский язык;
- русский язык;
- теория и история права и государства; история правовых учений;
- общая педагогика, история педагогики и образования;
- теория и методика обучения и воспитания ( по областям и уровням образования);
- теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры;
- общая психология, психология личности, история психологии;
- социальная психология;

**без отрыва от производства:**

- дифференциальные уравнения;
- математическое моделирование, численные методы и комплексы программ;
- экономика и управление народным хозяйством (по отраслям и сферам деятельности, в т.ч.: теория управления экономическими системами; макроэкономика; экономика и управления предприятиями, отраслями, комплексами; управление инновациями; региональная экономика; логистика; экономика труда; экономика народонаселения и демография; экономика природопользования; землеустройство и др.);
- белорусский язык;
- общая педагогика, история педагогики и образования;
- теория и методика физического воспитания, спортивной тренировки, оздоровительной и адаптивной физической культуры.

Поступающие в аспирантуру сдают конкурсные вступительные экзамены по философии, иностранному языку и специальной дисциплине в объеме действующей программы для вузов. Обучение в аспирантуре осуществляется с отрывом и без отрыва от производства. Срок обучения в аспирантуре с отрывом от производства - 3 года, без отрыва от производства – 4 года. В аспирантуру принимаются лица, имеющие высшее образование и способность к научным исследованиям. К вступительным экзаменам в аспирантуру приемными комиссиями допускаются лица, имеющие опыт практической работы ( в том числе опубликованные работы), и выпускники вузов по рекомендациям советов вузов (факультетов) при условии высокого уровня академической подготовки.

Прием лиц, поступающих в год окончания высшего учебного заведения, осуществляется преимущественно из числа выпускников магистратуры, а по специальности 1300.02 «Теория и методика обучения и воспитания (по областям и уровням образования)» – из числа лиц, имеющих опыт работы в сфере образования не менее 2–х лет.

Прием и обучение в аспирантуре для физических лиц, а также ведомств (организаций), не относящихся к Министерству образования, осуществляется на основании договоров или контрактов между физическим лицом, ведомством (организацией) и ГГУ. Обучение в аспирантуре иностранных граждан регулируются межгосударственными соглашениями, договорами с организациями или контрактами между иностранными гражданами и ГГУ.

Лица, поступающие в аспирантуру, подают заявление на имя ректора ГГУ и прилагают следующие документы:

- личный листок по учету кадров, автобиографию и три фотографии размером 4х6;
- список и копии опубликованных научных работ, изобретений, патентов и список отчетов о выполненных исследованиях и разработках; лица, не имеющие опубликованных научных работ, изобретений и патентов, представляют научные доклады (рефераты) по избранной теме в соответствии со специальностью;
- выписку из протокола заседания совета (факультета) высшего учебного заведения для лиц, рекомендованных в аспирантуру непосредственно после окончания высших учебных заведений;
- копии диплома о высшем образовании и выписку из зачетной ведомости (приложение к диплому);
- выписку из трудовой книжки;
- копии документов о сдаче кандидатских экзаменов (при наличии у поступающих в аспирантуру сданных кандидатских экзаменов);
- паспорт, диплом об окончании высшего учебного заведения и документы о сдаче кандидатских экзаменов предъявляются лично.

Лица, поступающие в аспирантуру по направлению ведомств (организаций) или самостоятельно, дополнительно предоставляют проект договора (контракт) между направляющей стороной и ГГУ.

Лица, сдавшие полностью или частично кандидатские экзамены, освобождаются от соответствующих вступительных экзаменов и пользуются преимущественным правом зачисления в аспирантуру по конкурсу.

Кроме того, при равном количестве баллов преимуществом при зачислении имеют лица у которых:

- более высокая оценка на вступительном экзамене по специальности;
- список публикаций, а также стаж работы по данной специальности;
- имеются дипломы лауреатов республиканского смотра-конкурса студенческих научных работ и республиканских научных конференций.

Лица, успешно сдавшие вступительные экзамены, но не прошедшие по конкурсу, могут быть зачислены в аспирантуру на контрактной основе.

Лица, зачисленные в аспирантуру с отрывом от производства, обеспечиваются стипендией. Иногородним предоставляется общежитие.

Лица, ранее прошедшие полный курс обучения в аспирантуре, правом повторного обучения без оплаты не пользуются.

Вступительные экзамены проводятся **с 1 по 30 октября 2004 года.**

Прием документов **с 30 августа до 10 сентября 2004 года.**

**Документы направлять по адресу:** 246019, г. Гомель, ул. Советская, 104, отдел аспирантуры (комн.4-6), тел.57-83-77.

**РЕКТОРАТ.**

# ЖИЛЬЕ: МЕЧТА И РЕАЛЬНОСТЬ

Преподаватели и сотрудники университета, стоящие на очереди для улучшения жилищных условий, могут стать членами ЖСК-143, который формируется на базе 108-квартирного жилого дома КПД-20 в микрорайоне №16. Этот дом будет строиться во исполнение поручения Президента Республики Беларусь по итогам встречи с членами Республиканского совета ректоров высших учебных заведений. Квартиры в нем выделяются для вузов г. Гомеля, в том числе и нашему университету: 6 – двухкомнатных и 1 –трехкомнатная.

Желающие стать членами ЖСК-143 будут строить квартиры за счет собственных средств и льготных банковских кредитов.

**За справками обращаться в профком ГГУ по тел.: 57-19-22.**

Спорт Спорт Спорт

# УКЛАД НАШЫХ СПАРТСМЕНАЎ

У г. Гродне прайшоў чэмпіянат Беларусі па летняму поліятлону, дзе за ўзнагароды змагаліся зборныя каманды абласцей і сталіцы.

У камандным заліку прызавая тройка наступная: Гомельская, Магілёўская вобласці і г. Мінск.

Значны ўклад у камандную перамогу ўнеслі студэнты нашага універсітэта: трэцякурсніца фізічнага факультэта Анастасія Курыкіна і першакурснік завочнага факультэта спецыяльнасці "Фізічная культура і спорт" Уладзімір Кісялёў. Яны ўзняліся на вышэйшую прыступку п'едэстала гонару ва ўзроставай групе 18-20 гадоў.

**В. МАРЧАНКА.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта, калектыў рэдакцыі газеты "Гомельскі універсітэт" выказваюць глыбокае спачуванне фатографу **ЧЫСЦІКУ Уладзіміру Паўлавічу** з выпадку напаткаўшага яго гора – смерці **МАЦІ.**

Рэктарат, грамадскія арганізацыі універсітэта выказваюць глыбокае спачуванне машыністцы канцыляры **ФЁДАРАВАЙ Марыі Еўдакімаўне** з выпадку напаткаўшага яе гора – смерці **МАЦІ.**


Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК — Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246019, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 2-14.
Тэл. 56-30-71.
E-mail: rggu@gsu.unibel.by
Зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі Рэспублікі Беларусь 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на Республиканском полиграфическом унитарном предприятии "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1. Качество печати соответствует качеству оригиналов заказчика.

РЭДАКТАР Тамара ДУБЯК

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 4258
Падпісана да друку 22.06.2004 г.